Пазакласнае чытанне

У часопісе «Полымя» пачынае друкавацца новы раман Людмілы Рублеўскай «Авантуры Вырвіча, Лёдніка і Чорнай Меланхоліі». Гэта шостая кніга вядомай авантурна-прыгодніцкай серыі пра шляхцюка Пранціша Вырвіча герба Гіпацэнтаўр і яго старэйшага сябра, полацкага доктара Баўтрамея Лёдніка. Прапануем чытачам «Звязды» пазнаёміцца з урыўкам з гэтага твора. Дзеянне адбываецца ў XVIII стагоддзі, у апошнія гады існавання Рэчы Паспалітай. Заканчваецца праўленне ўсемагутнага канцлера Антонія Тызенгаўза, інтрыгі якога зноў гоняць герояў у далёкую дарогу. Пранціш Вырвіч цяпер — шаноўны суддзя падкаморы, Баўтрамей Лёднік — паплечнік стваральніка медычнай акадэміі Жана Жылібера, жонка Лёдніка, чароўная Саламея, таксама займаецца лекарскай справай, а ягоная падрослая дачка Сафійка ўспадчыніла не толькі матчыну гожасць, але і неўтаймоўны бацькаў характар. І зноў — захапляльнае падарожжа па трагічных і яркіх старонках беларускай гісторыі.

Пачатак рамана чытайце ў № 8 часопіса «Полымя», працяг — у №№ 9 і 10.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

Урывак з рамана

«АВАНТУРЫ ВЫРВІЧА, ЛЁДНІКА І ЧОРНАЙ МЕЛАНХОЛІІ»

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ. ЯК ЛЁДНІКІ З ГРАФАМ МАНУЦЫ ПАЗНАЁМІЛІСЯ

Як сведчаць летапісы, у лета шэсць тысяч шасцісотае ад стварэння свету было на Полацак нашэсце наўяў. Гойсалі мерцвякі па вуліцах, саміх не відаць было, а вось сляды капытоў іхніх коней палачане бачылі выразна. Можа, прывідныя коні проста занадта хутка несліся для вока чалавечага, як умеюць чорныя духі гарцукі, якія возяць па небе агромністы вогненны жоран з паганскім Перуном?

Чацвёрка сытых чорных коней пёрла па старажытнай Альгердавай дарозе між Полацкам і Вільняй шыкоўную карэту, пазалочаную, з гербамі, так імкліва, нібыта ў ёй выправіліся на зладзейскую справу наўцы альбо хтосьці зацугляў перуновых гарцукоў. Лужыны ператвараліся ў феерверкі бруду, гасцінец ажно дрыжэў...

Ніхто не прытрымаў чорных коней, нават бачачы, што наперадзе валюхаецца груваcткі рыдван. Дарэмна два фурманы, што кіравалі рыдванам, чарнявы дзяцюк з квадратнымі плячыма і бялявы хлапец-мацак, спрабавалі адвесці свой экіпаж убок... Шалёная залачоная карэта дагнала рыдван якраз у самым нязручным месцы дарогі, калі з аднаго боку было густое кустоў'е, з з другога — узгорак, на які ўскарасквaліся танклявыя бярозкі.

Хрась!.. Залаты бок карэты ледзь не прыхіліўся да чорнай сценкі рыдвана, заднія колы экіпажаў сутыкнуліся, быццам няўважліваму шкаляру аднакласнік спрытна падставіў нагу... Вось і прыехалі. Без кола засталіся. А да Гародні ўсяго два пераезды!

Красамоўства фурманаў абедзвюх павозак змусіла б вядомага грэка Дэмасфена тэрмінова набраць у рот каменьчыкаў і зноў бегчы на бераг мора, трэніравацца ў вымаўленні складаных сінтаксічных фігур, няхай не дужа прыстойных.

Сітуацыю маглі ўладзіць толькі гаспадары. Пакуль Саламея супакойвала раз'юшанага Лёдніка, які ад штуршка ледзь не паляцеў на падлогу, Пранціш самавіта выйшаў з пахіленага рыдвана, паклаўшы руку на дзяржальна Гіпацэнтаўра. Гаспадар залачонай карэты не зрабіў ласку выйсці, але ягоны слуга ў венгерцы з залатымі галунамі расчыніў дзверцы, каб пан мог высунуцца вонкі і пакараць дзёрзкі сусвет.

Пан быў даволі гожы, гэткай саладжавай гожасцю, якую цэняць у куртуазных свецкіх салонах: чорныя выразныя вочы, акуратны нос, не кірпаты і не дзюбаты, румяныя шчокі, невялікі капрызны рот. Парыс, каб яго цапамі малацілі. Праўда, цяпер гожае аблічча псавала злосць.

— Вашыя фурманы мусілі збочыць.

Ружовыя вусны ўладальніка залачонай карэты засмактала ягоныя чырвоныя абцасы.

— Граф Нікола Антоній Мануцы, староста Опсаўскі.

А бож-жачкі, гонару колькі ў італьянчыка, як блох у бадзяжнага сабакі... Вырвіч ветліва схіліў галаву, стрымліваючы паблажлівую ўсмешку. Дык вось ён які, Мануцы, самазваны графчык! Прыехаў у Польшчу з Венецыі некалькі год таму, укруціўся ў давер да Панятоўскага, выконваючы самыя слізкія даручэнні... Дапамагчы з упадабанай красунькай сустрэцца, таго, хто перашкаджае, настрашыць, скалечыць ці са свету прыбраць... Хаця на першы погляд мала быў падобны да брэцёра. Нарэшце, венецыянец аказаў Цялку такую паслугу, якую не забываюць: ажаніўся з Ядвігай Струтынскай, амараткай караля, што трапіла ў цікавае, але непрыемнае становішча. Пані Ядвіга шылахвосткай была вядомай, першы яе муж, Цеханавецкі, з ёй са скандалам развёўся, з-за гожых вочак паненкі тады ў Рэчыцы цэлае пабоішча выйшла, з ахвярамі... І караля акруціла. Цяпер у сям'і графа гадаваўся маленькі Станіслаў Мануцы, па водгуках усіх — выліты Цялок. Сам Мануцы выдаваў сябе за нашчадка старажытнага венецыянскага роду, вось і змайстрачылі яму герб... А паралельна самазваны граф пасябраваў з расійскім паслом Штакельбергам і наладзіў сувязь з каханкам расійскай імператрыцы Пацёмкіным. Так што шпегаваў увішны італьянчык, сяброўчык такога ж падлючага авантурыста Казановы, на абодва бакі, а мо на тры ці чатыры. Такога ў бутэльку закаркуй — выслізне.

Між тым слугі абодвух экіпажаў узяліся правіць папсаваныя колы. А размова Пранціша з графчыкам набыла небяспечны паварот. Вырвіч справядліва лічыў, што вінаваты ў прыкрым сутыкненні ўладар залачонай карэты. Гэта ягоныя слугі мусілі прытрымаць коней.

Мануцы намякнуў, што спяшаецца ў інтарэсах караля.

Пранціш ганарыста заявіў, што яны выконваюць загад падскарбія, знакаміты доктар Баўтрамей Лёднік мусіць як найхутчэй з'явіцца ў Гародню.

Пачуўшы імя Чорнага Доктара, Мануцы змяніўся. Цёмныя вочы загарэліся азартам, ноздры вытанчанага носа драпежна разадзьмуліся, рука ў шаўковай пальчатцы сціснула дзяржальна шпагі... І раптам: заміж спешчанага хатняга сабачкі перад вамі — ікласты хорт, які лёгка ўчэпіцца ў загрывак. А ці праўда, што доктар Лёднік такі выбітны фехтавальшчык, што можа адзін выстаяць супраць дваццаці чалавек? А як ён па сценах скача? Забіць няўзброенай рукой, не дакранаючыся — таксама можа? Ці гэта плёткі? А ці згодзіцца пан доктар нешта прадэманстраваць?

Кадры з фільма «Авантуры Пранціша Вырвіча».

(Заканчэнне ў наступным нумары «Звязды».)